



## УСЁ НЕ ТАК, ЯК ЗДАЕЦЦА

На днях сястра паляцела ў Амерыку. Да мужа. Праз два гады пасля вяселля... Увесь гэты час «наша дзекабрыстка» ціха плакала ў падушку і жалілася на лёс. Маўляў, чаму ён не адпускае яе да каханага? Чаму так доўга цягнуць з візай? За што такая несправядлівасць? І вось на днях, калі ўсе сваякі сабраліся за сталом, каб праводзіць Наташу за акіян, яна здзівіла. «Ведаеш, — кажа, — я ўдзячна лёсу, што так доўга не адпускаў мяне... Бо, як медык, больш патрэбна была тут, побач з мамай, жыццё якой аказалася пад пагрозай...»

Усе два гады сястра пыталася «за што?». А цяпер разумее, «навошта».

Гадоў пяць таму, як гром сярод яснага неба, раздаўся тэлефонны званок. Паведамілі, што сяброўка, з якой мы тады дзялілі адзін пакой, трапіла пад машыну. У той вечар яна вярталася з дзіцячага анкацэнтра, дзе займалася валанцёрствам. У маёй галаве не ўкладалася, як з такім светлым чалавекам магла здарыцца бяда. Таня таксама, відаць, у той момант не разумела гэтага. Магчыма, крыўдзілася на лёс, пыталася, за што ён паслаў ёй такія выпрабаванні. І толькі пасля, праз нейкі час, мы зразумелі, «навошта».

Ніколі не забудуся, як незадоўга да аварыі сяброўка вярнулася ад свайго кавалера са слязамі, заракалася больш з ім не бачыцца. «Сумна мне з ім, нецікава!» Але, калі здарылася бяда, менавіта той нецікавы і сумны Сяргей аказаўся самым надзейным і клапатлівым. Ён прыходзіў да Тані ў палату штодзень, даглядаў яе. Не шкадаваў ні часу, ні грошай. Як гэта ні дзіўна гучыць, але менавіта аварыя дала магчымасць сяброўцы разгледзець і не прапусціць свой лёс. А Сяргею праявіць сябе з іншага боку, раскрыцца.

...Два анёлы (адзін больш вопытны, а другі зусім «зялёны») спусціліся на зямлю, ператварыліся ў людзей і пайшлі. Увечары яны папрасіліся пераначаваць у адным багатым доме. Трэба сказаць, што гаспадары, хоць былі і заможныя, гасцей не любілі. З дому на ноч выганяць, праўда, не сталі, але і паесці не прапанавалі, а спаць адправілі ў халодны падвал. Пакуль рассцілалі ложак, старэйшы анёл убачыў дзірку ў сцяне і заклаў яе. Малодшы пытаецца: «Для чаго?» «Усё не так, як здаецца...» — адказаў мудры анёл. Ішлі яны, ішлі. І на наступную ноч спыніліся ў зусім бедным доме. Муж з жонкай раздзялілі з імі сціплую вячэру і прапанавалі свае ложкі, каб госці выспаліся. А раніцай, калі анёлы прачнуліся, убачылі, што гаспадары горка плачуць. Іх адзіная карова, малако ад якой карміла ўсю сям'ю, ляжала мёртвай у хляве. Малодшы анёл запытаўся у старэйшага: «Як жа так, учора мы начавалі ў гаспадароў, у якіх усё было, а ты ім дапамог. А ў гэтых добрых людзей наогул амаль нічога няма, а ты дазволіў, каб у іх памерла адзіная карова. Чаму?» «Усё не так, як здаецца... — усміхнуўся бывалы анёл. — Калі мы начавалі ў падвале, я ўбачыў праз дзірку ў сцяне скарб. Але гаспадары абышліся з намі не надта гасцінна, і я адрамантаваў сцяну, каб яны не вельмі хутка знайшлі тое золата. А сёння ноччу, пакуль усе спалі, прыйшоў анёл смерці па жонку гаспадара, і я яго ўгаварыў забраць замест жанчыны карову. Я ж табе казаў: тут усё не так, як здаецца...»

Таму цяпер, калі ў мяне здараецца няшчасце, я сто разоў падумаю, перш чым скардзіцца на свой лёс ды павярхоўна меркаваць аб тым, што адбываецца. Бо жыццё ўжо неадназоva паказала-даказала, мы ніколі не ведаем усяго...

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*


# Сямейная газета

Выпуск № 18 (41)


■ Супермама-2015

# КАРЖОВА — ГЭТА НЕ ПСЕЎДАНІМ

Цудоўная гісторыя пра тое, як украінская дзяўчына знайшла сваё шчасце ў Беларусі, стала маці трох прыгожых дачок і навучылася ствараць шэдэўры з цеста

**Сабраць шматдзетную сям'ю Каржовых разам аказалася задачай складанай. Таццяна прыйшла на сустрэчу са старэйшай дачкой і адразу ж папярэдзіла: праз паўгадзіны ў Машы пачынаюцца заняткі па музыцы, і ім неабходна там быць. У пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Супермама-2015» увесь дзень распісаны па хвілінах. Праца, дом, дзеці. А ў дзяцей — гурткі, музычная школа. І трэба не толькі своечасова іх туды завесці, але і забраць. Муж дапамагае, але ён таксама чалавек заняты. Вось і даводзіцца рабіць усё ў тэмпе вальса. А часам і танга. Як на конкурсе «Супермама», дзе Таццяна Каржова разам са сваім сужэнцам Максімам замешвалі цеста ў рытме палкага танца. У белых фартухах на фоне вялізарнага торта, дзе ў стылі 3D-Mapping была праілюстравана гісторыя іх сям'і, яны выглядалі неверагодна.**

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***



■ Будзем знаёмы!

# ПЕРШАЕ СЯБРОЎСТВА

**Многія дарослыя лічаць, што дзіцячая дружба — рэч не сур'ёзная. Маўляў, сёння адзін сябар, заўтра іншы. Да пэўнага часу і я сумнявалася ў моцы сяброўскіх пачуццяў дашкалят. Пакуль мой трохгадовы сынок не пераканаў мяне ў іншым.**

Да дзяцей Даня цягнуўся з першых дзён, як пачаў добра хадзіць. Нават калі ён не гуляў з імі, усё роўна трэба было круціцца побач. Паступова ў яго з'явіліся адразу два сябры — Ромы-аднагодкі. Два гады, амаль дзень у дзень, мы сустракаліся з імі на дзіцячай пляцоўцы, бавілі разам час. Хапала ўсяго: і біліся, і абдымаліся, і цацкі адзін у аднаго забіралі, адным словам, сябравалі. Нават мы, мамы і таты, зблізіліся, хадзілі ў госці, даглядалі дзяцей адно аднаго.

Але прыйшоў нам час пераехаць на новую кватэру, і з Ромамі Даня развітаўся. Што тут пачалося! Ён бясконца пытаўся ў мяне, калі мы зноў паедзем да Раманаў, на вуліцы сярод чужых дзяцей намагаўся ўбачыць сваіх любых сяброў. Прайшоў год, і ўсё роўна кожны раз, як мы прыязджаем на былую кватэру — наведваем бацькоў, — Даня адразу ўсклікае: «Я тут з Ромамі гуляў!»

Аднойчы мы выпадкова сустрэліся з адным з Раманаў. На тварыку майго дзіцяці адразу з'явілася ўсмешка, але ён застыў у нерашучасці і пазіраў на мяне. «Так, гэта Рома!» — пацвердзіла я. І Даня імгненна пабег да сябра. «Прывітанне! Рома, гэта я!» — усхвалявана вымавіў ён. Але Рома нават не ўсміхнуўся, толькі наставіў на сына дзіцячы пісталет. «Рома, гэта я, Даня», — не адступаў мой. І паспрабаваў абняць хлопчыка. Але той адхіліўся ўбок, і зноў перад тварам з'явілася «пушка». «Забыўся», — зразумела я. І, убачыўшы, што Даня расчараваны і не ведае, што рабіць далей, пацягнула яго хуценька на іншую пляцоўку. Ніякіх пытанняў ад сына я не пачула, але на наступны дзень ён сур'ёзна заявіў: «Мабыць, Рома быў у дрэнным настроі. Яму не спадабалася мая новая прычоска». Маё сэрца занила ад жалю. Як растлумачыць майму звышадчувальнаму малому, што жаданне сябраваць не заўсёды ўзаемнае? Як маці мне стала крыўдна, што шчырыя пачуцці Дані былі ўспрыняты абыякава. Ды што зробіш, сябраваць не прымусіш.

Хутка нам прыйшоў час ісці ў дзіцячы садок. Даня туды збіраўся, як на свята. «Там шмат дзяцей! Ты



знойдзеш новых сяброў», — расказвала я яму пра садок. І неўзабаве сапраўды дома мы пачулі пра новага сябра сына. Даня называў яго «пажарны», бо ў таго была чырвоная бейсболка. І па расказах сына я зразумела, што абодвум вельмі даспадобы гэтая гульня ў ратавальнікаў ад агню. У іх нібы была брыгада, і яны ўсім дапамагалі ў бядзе. Даня так захапіўся, што прыйшлося і яму набыць чырвоную кепку. Праз пэўны час мы даведаліся, што хлопчыка завуць Акім, але ж дома ў размове ён так і застаўся «пажарным». Даня вельмі прывязаўся да новага сябра. Цяпер усе новыя цацкі ён абавязкова нёс у дзіцячы садок, каб пагуляць у іх разам з «пажарным», вельмі часта ўзгадваў яго ў размовах, вылучаў сярод іншых дзяцей у садку і хацеў запрасіць пагуляць дадому.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***